#eu4business

EaP | Eastern Partnership

# ЕС УМАЦОЎВАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ

У рамках ініцыятывы **EU4Business** ЕС выдзяляе **беларускім кампаніям фінансавыя сродкі**, праводзіць **трэнінгі** і ажыццяўляе **падтрымку экспарту** на новыя рынкі

## ХТО ЎЖО СКАРЫСТАЎСЯ ПАДТРЫМКАЙ?



СЯРГЕЙ МІСЯЧЭНКА
**ДЫРЭКТАР КАМПАНІІ**

атрымаў **фінансаванне ад ЕС і кансультацыйныя паслугі ЕБРР** па распрацоўцы бізнес-плана для кампаніі «Буслік», вытворцы дзіцячага адзення і харчавання, якую ён заснаваў у 2001 годзе. На сённяшні дзень крамы «Буслік» ёсць у кожным буйным горадзе Беларусі.




СВЯТЛАНА СІПАРАВА
**ПРАДПРЫМАЛЬНІЦА, ВЫТВОРЦА АДЗЕННЯ**

атрымала фінансаванне ад ЕС на развіццё моднага брэнда "Марк Фармэль". У выніку фінансавай падтрымкі тавараразварот вырас на 87%, а экспарт на суседнія рынкі ў два разы.



МІКАЛАЙ КУРАЕЎ
**ІТ-РАСПРАЦОЎНІК**

супрацоўнічаў з **бізнес-кансультантам з боку ЕБРР у рамках праграмы падтрымкі ЕС** у мэтах атрымання дапамогі ў **пашырэнні бізнесу**. За год тавараразварот кампаніі Мікалая павялічыўся на 65%.

## EU4BUSINESS У ЛІЧБАХ (2009-2016)

Уклад ЕС
**7.7 мільёнаў еўра**

паспрыяў атрыманню **30 мільёнаў еўра** крэдытных сродкаў кампаніям

**322** прадпрыемствы атрымалі падтрымку (крэдыты, трэнінгі, кансультацыйныя паслугі)

створана **820** новых працоўных месцаў

| ПАШЫРЭННЕ ДОСТУПУ ДА ФІНАНСАВАННЯ | РАЗВІЦЦЁ НАВЫКАЎ ВЯДЗЕННЯ БІЗНЕСУ | ПАДТРЫМКА ЭКСПАРТУ НА НОВЫЯ РЫНКІ |
|---|---|---|
| • Крэдыты для прадпрыемстваў, узначаленых жанчынамі<br>• Мікракрэдыты на стварэнне або развіццё малога бізнесу | • Адаптаваныя кансультацыйныя паслугі і падтрымка кампаній па пытаннях кадраў, інфармацыйных тэхналогій і менеджменту<br>• Навучальныя праграмы развіцця навыкаў прадпрымальніцкай дзейнасці<br>• Адаптаваныя праграмы навучання і настаўніцтва для жанчын-прадпрымальніц | • Бізнес-кансультацыі і навучанне для экспартна-арыентаваных кампаній |

## EU4BUSINESS У БЕЛАРУСІ

**Дапамагае малым прадпрыемствам у Беларусі расці**

**Забяспечвае доступ да фінансавых рэсурсаў**, падтрымку экспарту на новыя рынкі, сучасны практычны вопыт для росту

**У Беларусі працуе тэлефонная лінія EU4Business для мясцовых прадпрыемстваў:**

+375 (29) 700 86 50

ЕС ажыццяўляе падтрымку кампаній у **Беларусі** праз **ініцыятыву EU4Business**, якая рэалізуецца сумесна з ЕБРР, ЕІБ, Нямецкім банкам развіцця (KfW), Міжнародным гандлёвым цэнтрам, EUROCHAMBRES, UEAPME, АЭСР і Сусветным банкам.

EaP | Eastern Partnership

Даведайцеся больш аб даступных магчымасцях па спасылцы:
**www.eu4business.eu/by**